**Іван Мележ. Зберагчы агеньчыкі кахання**
**Урок беларускай літаратуры (10 клас)**

***І. А. Ганчарова,***
***настаўнік беларускай мовы і літаратуры***
***вышэйшай катэгорыі СШ № 32 г. Магілёва***

**Тэма.** Праблема кахання ў рамане Івана Мележа “Людзі на балоце”.

**Мэты:** паказаць актуальнасць рамана і надзённасць маральна-этычных праблем, якія ў ім вырашаюцца; стварыць умовы для развіцця творчай актыўнасці вучняў, самастойнасці мыслення; выхоўваць пачуццё адказнасці за свае ўчынкі; спрыяць усведамленню прыярытэту станоўчых маральных якасцей чалавека; выпрацоўваць навыкі адстойвання ўласнай пазіцыі.

**Форма:** урок-даследаванне.

**Абсталяванне:** партрэт І. Мележа, фотаздымкі галоўных герояў з кінафільма “Людзі на балоце” (Васіль, Ганна, Яўхім, Хадоська), выстава малюнкаў вучняў, запіс песні “Явар і каліна” на словы Янкі Купалы, вальс з кінафільма “Мой ласкавы і пяшчотны звер”, рэфлексійная карта “Разбітае сэрца”, стыкеры-сэрцы, тэкст рамана “Людзі на балоце” .

**Ход урока**

Юнацтва і кахае, і памыляецца,
і карае і сябе, і другога па-асабліваму.
Алесь Адамовіч

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Вызначэнне тэмы і мэты ўрока**

Гучыць лірычная мелодыя, вучаніца пачынае чытаць на памяць верш Я. Янішчыц

“Ты пакліч мяне, пазаві”. Яна са свайго месца ідзе да дошкі, потым падыходзіць да вучня, які, як бы у адказ ёй, пачынае чытаць на памяць верш М. Шабовіча “Нас цяпер аніхто не разлучыць”.

Якая тэма гучыць у гэтых вершах? (Гэта вершы пра каханне.)

Сёння на ўроку мы  будзем гаварыць менавіта пра каханне.

Мележаўскія героі – вашы аднагодкі, іх радасці, перажыванні, праблемы вельмі блізкія і зразумелыя вам, і з жыцця гэтых герояў можна і патрэбна ўзяць урокі, якія, магчыма, спатрэбяцца вам у жыцці. Таму мэта ўрока – не толькі раскрыць і ўсвядоміць тэму, але і ўбачыць актуальнасць рамана і надзённасць маральна-этычных праблем, якія вырашаюцца ў ім, зрабіць для сябе вывады.

**3. Актуалізацыя апорных ведаў**

✓ Якія асацыяцыі ўзнікаюць у вас, калі вы чуеце слова “каханне”?

✓ У сшытках прадоўжыце азначэнне: каханне  –  гэта…

Прыкладныя адказы вучняў: каханне – гэта свет, шчасце, радасць, кветкі, натхненне, палёт, сям’я, боль, перажыванні, хваляванні, пакуты, бяссонніца, слёзы, нянавісць, смерць і інш.

✓ Чаму ў вас побач са светлымі фарбамі ёсць і трагічныя ноткі?

Прыкладныя адказы вучняў: каханне можа ўзнесці чалавека да нябёс, а можа кінуць у самыя глыбокія нетры. Яно можа рабіць цуды, а можа прывесці да трагедыі. Для аднаго яно лекі, а для другога – самы страшэнны яд. Нездарма ж гавораць: “Ад кахання да нянавісці адзін крок”.

✓ Звернемся да выставы малюнкаў, на якіх вы адлюстроўвалі каханне.

Прыкладныя каментарыі вучняў да сваіх работ:

На маім малюнку каханне – райская птушка, вельмі прыгожая, чароўная, незвычайная. Але не кожны можа злавіць яе, не кожнаму дадзена яе ўтрымаць.

На маім малюнку каханне – карабель з ружовымі ветразямі, які здольны пераадолець любыя перашкоды, якому не страшны дзявяты вал, які імчыць у краіну Шчасця.

Для мяне каханне – гэта папараць-кветка: хто яе знойдзе, будзе заўсёды шчаслівы.

*Настаўнік.* Гарачая пара юнацтва! Яна хвалюе, яна трывожыць, яна прыносіць першае шчырае пачуццё – каханне. У кожнага яно сваё, але не кожны здольны на светлае каханне, не кожны разумее, як гэта цудоўна – кахаць!

**4. Даследаванне праблемы**

Загадзя клас быў падзелены ны тры групы, якія даследавалі жыццёвыя ўрокі Васіля і Ганны (група 1), Яўхіма і Ганны (група 2), Хадоські і Яўхіма (група 3).

*Пытанні для абмеркавання:*

1. Як зараджаецца каханне Васіля і Ганны
2. Чаму Ганна з усіх хлопцаў вёскі выбірае менавіта Васіля?
3. З чым параўновае іх каханне аўтар? (З вугольчыкамі, якія трымае ў сваіх далонях Васіль.)
4. Хто вінаваты (Васіль ці Ганна), што дарогі іх разышліся? ( Абодва, таму што няма ў каханні пераможцы. Калі б Васіль і Ганна з двух бакоў падзьмулі на агеньчык, то разгарэўся б ён моцным, яркім полымем. Але ж яны не зрабілі гэтага, і тыя вугольчыкі кахання, якія засталіся, паступова патухлі.)
5. А ці кахалі яны адзін аднаго? Дакажыце.

Вучні прыводзяць доказы, зачытваюць:

а) прастойваюць ночы напралёт пад старой грушай; б) Ганна з Васілём ласкавая, зусім не калючая, стрымлівае свой “язычок”; в) хвалюецца, калі ён трапляе да бандытаў, сядзіць у турме; г) Васіль, седзячы ў турме, думкамі з Ганнай; д) балючая рэўнасць да Яўхіма; е) на сходзе, калі абмяркоўваюць падаткі, уваходзіць Ганна, і ўсе думкі Васіля з такога важнага для яго пытання пераключаюцца на дзяўчыну.

6. Што паслужыла апошняй кропляй разрыву паміж Васілём і Ганнай? (Чуткі, што Яўхім згвалтаваў Ганну.)

***Сцэнка*** (Вучні разыгрываюць загадзя падрыхтаваны дыялог Васіля і Ганны.)

7. Чаму ж Васіль так упэўнены, што Ганна была з Яўхімам? (Бо Яўхім багаты, з зямлёй, і любая пайшла б з ім, калі б ён пазваў, паманіў бы пальцам, а чым Ганна адрозніваецца ад іншых дзяўчат?)
8. Чаму Ганна не апраўдваецца перад каханым, а, наадварот, на зло Васілю гаворыць, што сама, па сваёй ахвоце была з Яўхімам? (Крыўда вельмі моцная, што любы верыць чуткам, чужым людзям, а не ёй; жаночая гордасць; жаданне зрабіць і яму так балюча, як ён робіць ёй.)
9. Чаму Васіль не змагаецца за каханне, здаецца, саступае? (Для Васіля зямля, дабрабыт стаяць на першым месцы. І ён верыць, што Яўхім ссільнічаў Ганну і яна яму паддалася, таму што не магла адмовіць багатаму, бо здаўна лічылася шчасцем выйсці замуж за багатага, ажаніцца з багатай. Па-другое, ён і сам бы хацеў узяць не Ганну, а багацейшую дзяўчыну, з большым пасагам. На папрок Хоні ён адказвае: …)

10. Ці можна сказаць, што Васіль не вельмі ўпэўнены ў сабе, таму і не змагаецца за Ганну? (Не. Ён не ўпэўнены ў тым, ці патрэбна яно яму гэта каханне. Бо за зямлю ён змагаецца вельмі ўпарта. І зямля перавешвае каханне, перамагае яго.)

11. Чаму Ганна з яе характарам не змагаецца за каханне?

***Хвілінка адпачынку.*** Гучыць мелодыя вальса з кінафільма “Мой ласкавы і пяшчотны звер”.

*Настаўнік.* Уявіце, што вы танцуеце са сваім каханым чалавекам, моцна трымаеце сваё шчасце, вакол вас радасць, пяшчота, надзея. Вы – шчаслівыя! Танцуйце, і хай каханне ніколі не пакідае вас!

12. Ці кахае Ганна Яўхіма? Дакажыце.

13. Калі ж кахання няма, чаму яна выходзіць замуж за Яўхіма? (Крыўда на Васіля, угаворы мачыхі, беднасць, “сцерпіцца – злюбіцца”, уплыў Карчоў, на зло Васілю, каб зрабіць яму балюча і г.д.)

14. Чаму Яўхім бярэ замуж Ганну – “зрэбную каралеву”? Ці кахае ён яе? (Не. Яўхім быў першы хлопец на вёсцы, ён прывык, што ўсе дзяўчаты сохнуць па ім, што ўсё самае лепшае павінна належыць яму: фарсіста апрануты, у ботах, адзіных на ўсе Карані, у крамнай вопратцы, ён хоча займець як ўпрыгожанне і першую вясковую красуню. У яго няма рэўнасці, ён нават на вяселлі гатовы ўступіць Ганну Дубадзелу, а за непаслушэнства ледзь прылюдна не пабіў яе. Перад вяселлем ён робіць ёй падарунак, але шчырасці ў гэтым няма: ён траціць грошы і пры гэтым гаворыць, што яны вернуцца да яго).

15. Як вы расцэньваеце ўчынак Ганны?

16. Як вы разумееце эпіграф да сённяшняга ўрока?

17. Як пакарала сябе Ганна?

18. Як пакараў сябе Васіль?

19. Які вывад можна зрабіць для сябе?

20. Раскажыце, што вы ведаеце пра Хадоську?

21. Ці кахае Хадоська Яўхіма?

22. Ці кахае Яўхім яе?

23. Ці можам мы асудзіць Хадоську?

24. Як пакарала сябе Хадоська?

25. Якое выйсце вы б маглі ёй прапанаваць? (Расказаць Глушаку, параіцца з маці, звярнуцца да сваёй сяброўкі Ганны.)

26. Чаму Хадоська нават не паспрабавала пагаварыць з блізкімі ёй людзьмі? (Страх, боязь асуджэння, крыўда на Ганну і г.д.)

27. Ці зразумелі яны яе? Ці здольныя былі дапамагчы?

28. Якія вывады з гэтай сітуацыі можна і трэба зрабіць для сябе?

29. Ці магчыма шчасце без кахання?

30. Ці дастаткова кахання,каб быць шчаслівым?

*Настаўнік.* Давайце выведзем формулы шчасця:

Васілёва шчасце = … (зямля, гаспадарка, багацце, Ганна і г.д.)
Ганнніна шчасце = … (Васіль, каханне, гаспадарка, дзеці, багацце і г.д.)
Яўхімава шчасце = … (багацце, самалюбаванне, зямля, гаспадарка, дзяўчатыі г.д.)
Хадосьчына шчасце = …(Яўхім, каханне, дзеці, гаспадарка і г.д.)

Формула шчасця = … (няма агульнай формулы, кожны чалавек на працягу жыцця яе складае сам.)

**5. Рэфлексія**

*Настаўнік*. Даўным-даўно людзі былі падобныя да страшэнных пачвар: мужчына і жанчына былі адзіным цэлым. Але дзве палавінкі ніяк не ўжываліся адна з адной. Таму, раззлаваўшыся, Бог раздзяліў іх. З таго часу кожны імкнецца знасці сваю палавінку, і, каму гэта ўдасца, той зведае сапраўднае шчасце.

Я хачу, каб кожны з вас знайшоў сваю палавінку, зведаў сапраўднае каханне, бо гэта вялікае шчасце – кахаць і быць каханым!

Вазьміце стыкеры-сэрцы, напішыце свае пажаданні. Давайце разам “вылечым” наша разбітае сэрца. Пачынайце словамі: “Я хачу…” (гучыць мелодыя песні “Явар і каліна”, вучні пішуць пажаданні (адзін сказ), выходзяць, чытаюць іх і клеяць стыкеры, дапаўняючы другую палову разбітага сэрца.)



- ✓ Я хачу, каб каханне прыносіла толькі радасць
- ✓ Я хачу, каб каханне было вечным
- ✓ Я хачу, каб каханне не было сляпым
- ✓ Я хачу, каб кожны з нас сустрэў сваю палавінку
- ✓ Я хачу, каб каханне было без падману
- ✓ Я хачу, каб каханне было светам
- ✓ Я хачу, каб каханне не прыносіла болю
- ✓ Каханне – гэта багацце. Беражыце яго!

**6. Дамашняе заданне**

Сачыненне-разважанне:

- ✓ “Калі б я была на месцы Ганны Чарнушкі” (дзяўчатам).
- ✓ “Калі б я быў на месцы Васіля Дзятла” (хлопцам).